# Нашы юбіляры

## ЛЮДМІЛА МІКАЛАЕЎНА ЧУМАК



Адзначыла свой юбілей загадчыца кафедры прыкладной лінгвістыкі філалагічнага факультэта, доктар філалагічных навук Людміла Мікалаеўна Чумак.

Нарадзілася Людміла Мікалаеўна на Гродзеншчыне. У 1971 г., пасля заканчэння з адзнакай Гродзенскага педагагічнага інстытута імя Я. Купалы, працавала настаўніцай у Парэчскай сярэдняй школе Лідскага раёна, затым у Гродне. У 1973 г. паступіла ў аспірантуру на кафедру рускай мовы БДУ імя У.І. Леніна і ў 1977 г. паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме "Способы выражения объектных отношений в современном русском языке".

З таго часу лёс Людмілы Мікалаеўны цесна звязаны з лёсам філалагічнага факультэта. Спачатку яна працавала дацэнтам на кафедры рускай мовы, а з 1995 г. узначаліла кафедру прыкладной лінгвістыкі, якая з'яўляецца базавай у рэспубліцы па падрыхтоўцы русістаў замежных краін і выкпадчыкаў рускай мовы як замежнай для ВНУ рэспублікі. Сёння кафедра – адзіны ў рэспубліцы цэнтр падрыхтоўкі кадраў і па такой спецыяльнасці, як камп'ютэрная лінгвістыка.

Навуковыя інтарэсы Л.М. Чумак звязаны з сінтаксісам сучаснай рускай мовы, рускай мовай як замежнай, лінгвакультуралогіяй. Яе доктарская дысертацыя "Лингвокультурологическая характеристика синтаксических систем русского и белорусского языков" з'явілася асновай для новага напрамку ў мовазнаўстве – супастаўляльна-культуралагічнага сінтаксіса як новай галіны кантрастыўнай граматыкі.

Людміла Мікалаеўна Чумак – аўтар болей за 120 навуковых прац. Сярод іх манаграфія "Синтаксис русского и белорусского языков в аспекте культурологии", брашура "Синтаксические единицы языка как носители национально-культурной информации", даклад на VIII Кангрэсе Міжнароднай асацыяцыі выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры, 14 артыкулаў у далёкім замежжы (Польшча, Германія, Югаславія, Славакія), вучэбна-метадычныя дапаможнікі І інш.

Энергіі і мэтанакіраванасці Людмілы Мікалаеўны можна толькі пазайздросціць. Многія з членаў кафедры ўдзячны ёй за тое, што дзякуючы яе ініцыятыве выйшлі ў свет многія навуковыя выданні кафедры.

Шчыра віншуем Людмілу Мікалаеўну з юбілеем і жадаем ёй моцнага здароўя, шчасця ў сямейным жыцці, новых творчых поспехаў у працы.

**Калектыў кафедры прыкладной лінгвістыкі**



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm